УДК 316.4/476.4/

*К.Л. ЛАТОЦІНА, І.К. МЫЧКОВА*

# ДЭМАГРАФІЧНЫЯ ПАГРОЗЫ У СЕЛЬСКАЙ МЯСЦОВАСЦІ МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ І ІХ ПАПЯРЭДЖАННЕ

Як вядома, эканоміка не можа развівацца без насельніцтва, а народанасельніцтва выступае як найважнейшы фактар эканамічнага развіцця грамадства. Дэмаграфія – гэта стрыжань сістэмы навуковых ведаў пра народанасельніцтва дадзенага рэгіёна.

Ва ўказе прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб дэмаграфічнай бяспецы ў Рэспубліцы Беларусь» ад 4 студзеня 2002 года асаблівая ўвага ўдзяляецца дэмаграфічнай бяспецы на вёсцы [1, с. 17].

Дэмаграфічная бяспека – гэта стан абароненасці сацыяльна-эканамічнага развіцця любога рэгіёна і грамадства ад дэмаграфічных пагроз. У цяперашні час на тэрыторыі любога сельскага раёна і канкрэтнага населеннага пункта асноўнымі відамі дэмаграфічных пагроз з'яўляюцца:

– дэпапуляцыя сельскага насельніцтва;
– старэнне насельніцтва ў сельскай мясцовасці;
– нерэгуляваныя міграцыйныя працэсы на тэрыторыі рэгіёна;
– дэградацыя інстытута сельскай сям'і ў рэгіёне.

Гэтыя чатыры віды дэмаграфічных пагроз з'яўляюцца вядучымі ва ўмовах ўсёй краіны і асабліва Магілёўскай вобласці. Яны набываюць усё больш нарастальнае негатыўнае ўздзеянне.

У прыватнасці, дэпапуляцыя сельскага насельніцтва – гэта працэс, пры якім памірае больш насельніцтва, чым нараджаецца. Адначасова з гэтым памяншаецца агульная колькасць усяго насельніцтва. Напрыклад, у сельскай мясцовасці

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Магілёўскай вобласці ў 1990 годзе колькасць насельніцтва складала 413,4 тыс. чалавек, а ў 2001 годзе – толькі 336,1 тыс. чалавек (гл. [2, с. 4]). Інакш кажучы, колькасць сельскага насельніцтва паменшылася на 77,3 тыс. чал., або на 18,7%. У сярэднім на аднаго сельскага жыхара вобласці зараз прыходзіцца 2,5 чал. гарадскіх жыхароў.

На дзесяць народжаных у цяперашні час у вёсках вобласці прыходзіцца 35 памерлых.

Вельмі адмоўнае ўздзеянне на дэмаграфічную сітуацыю абласнога рэгіёна аказвае і такая важная дэмаграфічная пагроза як старэнне сельскага насельніцтва. Удзельная вага асобаў, маладзейшых за працаздольны ўзрост, на сяле ў 1990 годзе склала толькі 20,9%, а ў 2001 годзе – 19,5%. Затое доля асобаў, старэйшых за працаздольны ўзрост за гэты перыяд знаходзіцца на ўзроўні 33-36%. Гэты паказчык ў вёсках Бялыніцкага раёна дасягнуў 39,2 працэнта, а Чавускага – 40,6%.

Такое інтэнсіўнае пастарэнне людзей, высокая смяротнасць і нізкая нараджальнасць прывялі да вымярання цэлых вёсак. Толькі за дзесяць апошніх гадоў па гэтай прычыне знікла 160 вёсак.

Выключна негатыўнае ўздзеянне на агульную дэмаграфічную сітуацыю на сяле аказвае і нерэгуляваная міграцыйная рухомасць насельніцтва. Празмерная міграцыя сельскага насельніцтва ў буйныя і малыя гарады па-ранейшаму абвастраюць дэфіцыт працоўных рэсурсаў, парушаюць нармальны рэжым ўзнаўлення сельскага насельніцтва. Напрыклад, у 2001 годзе ў вобласць прыехала 9,2 тыс. чалавек, а выехала 10,9 тыс. чалавек (гл. [3], с. 17). Агульны адток насельніцтва склаў 1,7 тыс. чалавек. Што ж датычыцца міграцыі ўнутры вобласці, то яна ў 2001 годзе знаходзілася на ўзроўні 14,7 тыс. чалавек як па прыбыцці, так і выбыцці.

Нарэшце, вельмі моцны ўплыў на дэмаграфічную сітуацыю сельскага насельніцтва вобласці аказвае такая дэмаграфічная пагроза, як дэградацыя інстытута сельскай сям'і.

Сям'я ў сучасных умовах паступова перастае быць трывалай ячэйкай нашага грамадства. Добрых, узорных і паўнацэнных сем'яў у сельскай мясцовасці засталося мала. Паўсюль ідзе сапраўдная дэградацыя асобы і дэградацыя інстытута сям'і. Галоўнымі прычынамі гэтага служаць п'янства, алкагалізм, наркаманія. Шлюбна-сямейныя адносіны становяцца вельмі кволымі і няўстойлівымі. Напрыклад, у 2000 годзе ў цэлым па вобласці на 100 шлюбаў прыходзіцца 70 разводаў, у Магілёўскім раёне – 120 разводаў, у Касцюковічскім – 90 разводаў (гл. [3], с. 106). Акрамя таго, зараз вельмі распаусюджаным тыпам сям'і з'яўляецца сям я, што складаецца з мужа, жонкі і аднаго дзіцяці ці толькі з мужа і жонкі. На іх долю прыходзіцца 73% усіх сямей абласнога рэгіёна.

Як быць? Дзе выйсце? Як папярэдзіць такія моцныя дэмаграфічныя пагрозы? Перш за ўсё неабходна ў тэрміновым парадку распрацаваць комплексныя праграмы дэмаграфічнай бяспекі для кожнага сельскага рэгіёна прымяняльна да асобнага сельскага савета, асобнай вёскі. Трэба строга ажыццяўляць маніторынг дэмаграфічнай бяспекі ў кожным раёне і сельскім населеным пункце.

Неабходна праводзіць комплексную работу, што накіравана на павышэнне матэрыяльнага дабрабыту, якасці і ўзроўню жыцця людзей, шляхам павышэння зарплаты, зніжэння цэн, інфляцыі і беспрацоўя. Бо ў калгасах сярэднямесячная зарплата за 2002 год склала толькі 87,6 тыс. руб., а ў саўгасах – 107,8 тыс. руб. Прычым памер сярэднямесячнай зарплаты ў калгасах меншы за мінімальны спажывецкі бюджэт на 40%, а ў саўгасах – на 26%.

Адначасова з гэтым неабходна павысіць памер дапамогі па беспрацоўі: ніжняя мяжа яго павінна быць 20-40% ад пражытачнага мінімуму. Пара ўвесці сістэму страхавання рызыкі беспрацоўя: 1% ад штомесячнага фонду зарплаты і

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

0,5% ад штомесячнага фонду зарплаты (адпаведна за кошт прадпрыемства і работніка).

Надышоў час прадстаўляць вучням шматдзетных сем'яў адукацыйны крэдыт на тэрмін да 10 гадоў на суму не больш за 75% ад кошту навучання пры стаўцы 21% гадавых.

Пры доўгатэрміновым крэдытаванні жыллёвага будаўніцтва для маладых сямей за нараджэнне першага дзіцяці лічым неабходным скасоўваць 10% доўгу, двух дзяцей – 25%, трох дзяцей – 45%, чатырох і больш – 70% доўгу.

У мэтах аховы рэпрадукцыйных правоў грамадзян неабходна за кожнае дзіцяці дадаваць жанчыне да працоўнага стажу два гады. Адначасова з гэтым трэба прадугледзіць пры выхадзе на пенсію павелічэнне апошнім асобам, што выхоўваюць трох і больш дзяцей, пенсіі на 10%.

Мэтазгодна ўзмацніць дзяржаўны кантроль за захаваннем інтарэсаў працуючых членаў сям'і. Забяспечыць даступнасць для ўсіх сем'яў, што маюць дзяцей, паслуг дзіцячых дашкольных устаноў і ільготных летніх аздараўленчых лагераў.

Неабходна прадугледзець ў заканадаўстве адказнасць работадаўцаў і іншых афіцыйных асобаў за ўтойванне інфармацыі пра рызыку для здароўя працуючых асоб ў шкодных і цяжкіх умовах. Бо колькасць памерлых па прычыне нясчасных выпадкаў, атручванняў і траўм штогод расце. Толькі за 2002 год у вобласці па гэтых прычынах памерла 1999 чалавек. Асноўнай задачай для органаў аховы здароўя вобласці павінна быць развіццё перасоўных форм лячэбнадыягнастычнай дапамогі на вёсцы. Рэалізацыя гэтых і іншых мераў дазволіць у многім палепшыць дэмаграфічную сітуацыю ў сельскай мясцовасці абласнога рэгіёна.

*ЛІТАРАТУРА*

1. Национальный центр правовой информации. – Могилев: Центр правовой информации облисполкома, 2002. – 136 с.
2. Народное хозяйство Могилевской области в 2001 г. – Могилев: Изд-во Облстатуправления. – 96 с.
3. Социально-экономическое положение Могилевской области в 2002 г. – Могилев: Изд-во Облстатуправления, 2003. – 124 с.

SUMMARY

*The article deals with dangerous demographic situation in the country-side, Mogilev region serving as an example. Certain economic measures able to improve the situation are proposed.*

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова